Адрасы «Дажынак»

Апошнія выхадныя верасня адзначыліся правядзеннем свята працаўнікоў вёскі адразу ў трох абласцях краіны — Віцебскай, Гомельскай і Мінскай. Як заўсёды, ушаноўваліся найлепшыя хлебаробы. Сталіцы сёлетніх абласных «Дажынак» атрымалі падарункі ў выглядзе адрамантаваных і новых аб'ектаў. А гэта добрая традыцыя, якая працягваецца.

Мазыр

Збожжавы патэнцыял Палесся

Буйны цэнтр Прыпяцкага Палесся, Мазыр, які не так даўно адзначыў 865-ы дзень нараджэння, у атмасферу маштабнага фестывалю працаўнікоў вёскі акунуўся не ўпершыню. Амаль два дзесяцігоддзі таму ў Мазыры праходзілі рэспубліканскія «Дажынкі». Сёлета да абласнога свята горад рыхтаваўся не менш грунтоўна: адрамантаваны дарогі, новы выгляд атрымалі фасады жылых дамоў, адноўлены вулічныя лесвіцы — своеасаблівыя пешаходныя артэрыі, якія звязваюць розныя раёны горада. Якраз імі актыўна карысталіся госці райцэнтра, якія імкнуліся пазнаёміцца са славутасцямі горада.

Увогуле менавіта Мазырскі раён — адзін з бяспрэчных лідараў сельгасвытворчасці паўднёва-ўсходняга рэгіёна Беларусі.

Між тым Гомельшчына па праве можа ганарыцца вынікамі работы сваіх аграрыяў. Сёлета ў вобласці толькі збожжавых і зернебабовых (без уліку кукурузы) — намалочана на траціну болей, чым летась, — усяго каля 915 тысяч тон. Больш за ўсё збожжа сабралі ў Буда-Кашалёўскім раёне — 93 тысячы тон, у Рэчыцкім і Рагачоўскім раёнах — 86 і 85 тысяч адпаведна. Самыя высокія тэмпы росту па гэтым паказчыку — больш за 170 працэнтаў — у аграрыяў Веткаўшчыны і Чачэршчыны. У цэлым 10 раёнаў Гомельскай вобласці паказалі тэмп росту валавога збору, вышэйшы за сярэднеабласны.

Першае месца сярод раёнаў па вытворчасці збожжа засталося за Жлобінскім раёнам. Там тэмп росту валавога збору збожжа склаў 130 % да сярэдняга ўзроўню папярэдніх трох гадоў. Сярод сельскагаспадарчых арганізацый па гэтым паказчыку пераможцам названа эксперыментальная база «Крынічная» Мазырскага раёна.

Першым у рэгіёне завяршыў уборку збожжавых Добрушскі раён. Калі гаварыць аб ураджайнасці, то самы высокі паказчык — 53 цэнтнеры з гектара — адзначаны ў ААТ «Отар» Чачэрскага раёна.

Памочнік Прэзідэнта, інспектар па Гомельскай вобласці Юрый ШУЛЕЙКА зачытаў прывітальны адрас кіраўніка дзяржавы:

— Працаўнікі вёскі Гомельскай вобласці ў чарговы раз разбілі стэрэатып пра тое, што геаграфічнае становішча рэгіёна, невысокая бальнасць зямель і частыя катаклізмы надвор'я з'яўляюцца непераадольнымі перашкодамі для дасягнення жаданых паказчыкаў. Вы значна павялічылі намалот, вырасцілі добры ўраджай збожжавых, кукурузы, гародніны, заклалі дастатковую кармавую базу для вытворчасці малака і мяса, а цяпер актыўна рыхтуеце свае палі да новага сезона. Усё гэта красамоўна сведчыць аб тым, што вяскоўцы знаходзяцца на правільным працоўным шляху і патэнцыял Палесся далёка не вычарпаны.

Пераможцы абласных «Дажынак» з Буда-Кашалёўскага раёна Васіль ГАЛАВАЦКІ і Дзмітрый КАРПАЎ.

Фота БелТА.

Звяртаючыся да ўдзельнікаў свята, **старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ** чарговы раз падкрэсліў важнасць прафесіі хлебароба:

— Хлеб — найважнейшая каштоўнасць, мерка хлебаробнага майстэрства, сімвал дабрабыту і дастатку. І менавіта таму ў Беларусі «Дажынкі» адзначаюць з такім размахам, — адзначыў кіраўнік рэгіёна. — Праца хлебароба — адна з самых цяжкіх, а ў Гомельскай вобласці, якая па сваіх кліматычных умовах з'яўляецца зонай рызыкоўнага земляробства, тым больш. Таму для атрымання выніку і намаганняў даводзіцца прыкладаць больш, — падкрэсліў Генадзь Салавей.

Між тым падзякі Прэзідэнта Беларусі ўдастоіліся дырэктар УП «Палессе-Аграінвест» Петрыкаўскага раёна Міхаіл Капінскі і механізатар агракамбіната «Холмеч» Рэчыцкага раёна Іван Вырвіч. Ганаровымі граматамі Адміністрацыі Прэзідэнта ўзнагароджаны дырэктар КСУП «Саўгаскамбінат «Зара» Мазырскага раёна Алег Слінько і трактарыст-машыніст агракамбіната «Холмеч» Васіль Коваль.

Найлепшым маладзёжным экіпажам прызнаны экіпаж «Савецкай Беларусі» Рэчыцкага раёна — Дзмітрыя Ляшчынскага і Рамана Даніліка. Першае месца сярод вадзіцеляў на перавозцы зерня ад камбайнаў прысуджана Рыгору Малочку, які працуе ў ААТ «Чамярыскі» на Брагіншчыне.

Дыпломы першай ступені сярод галоўных аграномаў уручылі Мікалаю Быкоўскаму з СВК «50 год Кастрычніка» Рэчыцкага раёна і Алесі Крывіцкай, якая прадстаўляе аграфірму імя Лебедзева РУП «Гомельэнерга» ў Веткаўскім раёне.

На фестывалі былі ўшанаваны ўладальнікі другіх і трэціх месцаў, а таксама ўручаны ўзнагароды за шматгадовую добрасумленную працу, прафесіяналізм і ўклад у развіццё галіны.

Госці свята традыцыйна дружнай калонай прайшлі па цэнтральнай вуліцы горада. Святочнаму параду аграрыяў, якія прыехалі ў Мазыр з 21 раёна Гомельшчыны, спрыяла і надвор'е.

Для ўдзельнікаў свята, а таксама жыхароў і гасцей Мазыршчыны, была арганізаваная выстаўка айчыннай сельскагаспадарчай тэхнікі.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Чэрвень

Дзіцячы садок у падарунак

Пачынаючы з самай раніцы ў Чэрвені панавала святочная атмасфера — працавалі гандлёвыя рады, сцэнічныя пляцоўкі, «Горад майстроў». Гасцей свята чакалі таксама выстаўкі караваяў і снапоў рэгіёнаў вобласці, а таксама мастацкіх работ майстроў народных рамёстваў. Таксама да абеду на стадыёне сярэдняй школы № 2 аматараў спорту чакала спартыўная пляцоўка «Спорт для ўсіх».

Фота БелТА.

Старшыня Чэрвеньскага райвыканкама Віталь КАЗЛОЎ перадае эстафету «Дажынак» старшыні Капыльскага райвыканкама Сяргею ПІЛІШЧЫКУ.

і гэта былі не ўсе падарункі да «Дажынак». Так, адбылося адкрыццё ясляў-садка «Пчолка». Урачыстае мерапрыемства наведаў **старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН.**

«Пчолка» стаў сёмым дзіцячым садком у Чэрвені. Адкрыліся 12 груп, разлічаных на 230 месцаў: чатыры старэйшыя, тры сярэднія і малодшыя і дзве ясельныя. Аб'ект цалкам пакрывае патрэбу Чэрвеня ва ўстановах дашкольнай адукацыі. Спартам дзеці змогуць займацца ў басейне і абсталяванай фізкультурнай зале. Дарэчы, гэта адзіная дашкольная ўстанова Чэрвеня, дзе ёсць басейн. Ёсць таксама дзве трэнажорныя залы, адна з якіх — з ЛФК-профілем. Там пад наглядам спецыялістаў будуць займацца малыя з аслабленым здароўем.

А пасля абеду адбылася цырымонія ўзнагароджання найлепшых хлебаробаў. «Цяперашні сезон увойдзе ў гісторыю Міншчыны як год, у якім атрымана два мільёны тон збожжа з васьмі па краіне ў цэлым, гэта значыць чвэрць ураджаю, — адзначыў **першы намеснік старшыні Мінаблвыканкама Сяргей ЛЯЎКОВІЧ.** — Усё гэта — вынік намаганняў працаўнікоў вёскі, а такіх у цэнтральным рэгіёне больш за 57 тысяч. Сёння хацелася б падзякаваць кожнаму. Упэўнены, што патэнцыял нашай вобласці яшчэ вышэйшы, таму жадаю новых здзяйсненняў і перамог. Усе рэкорды яшчэ наперадзе!»

Адгрымела галоўнае аграрнае свята вобласці, падчас якога цэлы дзень у паветры лунала радасная атмасфера. Калі афіцыйная частка скончылася, прагучалі ўсе словы падзякі, а ўзнагароды і памятныя падарункі дасталіся сваім уладальнікам, пачаўся святочны канцэрт.

На галоўнай сцэне выступалі зоркі беларускай і расійскай эстрады, сярод якіх — Алёна Ланская, Руслан Аляхно, гурт «Правакацыя». Гледачы — жыхары і госці Чэрвеня, работнікі сельскагаспадарчай сферы — падпявалі артыстам, танцавалі і весяліліся. Пасля канцэрта неба Чэрвеня расквецілася святочным салютам.

Сяргей КУРКАЧ.

Віцебск

Самы важкі каравай пяцігодкі

Спякотнае летняе надвор'е быццам бы падзякавала хлебаробаў за напружаную працу, падараваўшы два цёплыя дні адпачынку тым, хто месяцамі падчас сяўбы і бітвы за ўраджай працаваў без перабольшвання з раніцы да ночы. Не да шашлыкоў, не да курортаў і тым больш не да пратэстаў было тым, хто здабываў краіне хлеб.

Фота БелТА.

Святочнае шэсце ў Віцебску.

Сярод ганаровых гасцей свята быў **старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.** Дарэчы, доўгі час кіраўнік беларускага парламента ўзначальваў абласную выканаўчую ўладу Віцебшчыны, таму ў Прыдзвінні не чужы і не па чутках ведае ўсю адказнасць за вынікі сяўбы і ўборку ўраджаю. Ён падзякаваў цяперашняму губернатару за асабісты ўклад у развіццё аграпрамысловага комплексу.

Сёлета ў нашых хлебаробаў з поўначы па выніках жніва ёсць падставы для гонару. Як падкрэсліў **старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ,** сёлета ўстаноўлены рэкорд пяцігодкі: агульны намалот збожжавых — парадку аднаго мільёна 77 тысяч тон (сярэдняя ўраджайнасць больш за 31 цэнтнер з гектара). Пры гэтым упершыню ў Аршанскім і Віцебскім раёнах «каравай» заважыў 125 і 117 тысяч тон адпаведна — такіх паказчыкаў тут раней не было.

А яшчэ адзін ганаровы госць — **губернатар Пскоўскай вобласці Расіі Міхаіл ВЯДЗЕРНІКАЎ** у інтэрв'ю журналістам не раз падкрэсліваў, што ёсць чаму павучыцца ў беларусаў — культуры земляробства, комплекснаму падыходу...

У якасці падарунка да «Дажынак» Віцебск атрымаў футбольны манеж. Адкрыўся пасля рэканструкцыі сквер імя Кірава насупраць чыгуначнага вакзала. Што цікава, там цяпер ёсць арка з выявай герба Віцебска. Можна ўбачыць і скульптуру, якая прысвечана моладзі 1960-х. Хлопец з гітарай схіліў калена перад дзяўчынай. Яна трымае ў руцэ вершы і часопіс «Маладосць».

Да «Дажынак» гараджане атрымалі яшчэ шмат падарункаў, якія былі неабходныя Віцебску. У прыватнасці, раней адкрылі падземны пераход — даўгабуд яшчэ савецкага часу. А побач на новым участку праспекта Будаўнікоў — у бок спальнага мікрараёна «Білева» — 1 верасня адчыніла дзверы новая школа.

Цырымонія ўшанавання найлепшых хлебаробаў Прыдзвінскага краю прайшла ў Летнім амфітэатры на галоўнай сцэнічнай пляцоўцы міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

У праграме былі выстаўкі караваяў раёнаў вобласці, сельскагаспадарчай тэхнікі, рэспубліканскага маладзёжнага інавацыйнага праекта «100 ідэй для Беларусі». Зацікавілі і інтэрактыўная пляцоўка МНС, паказальныя выступленні па перацягванні велікагрузнага аўтатранспарту, «стаянкі» клубаў гістарычнай рэканструкцыі, разнастайныя канцэртна-забаўляльныя праграмы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.